# Загадкі бабулінай казкі

## Настальгічны калядны нарыс. Але не зусім

**Узімку, калі надыходзіць час калядных свят і лёгкія сняжынкі за акном талакуюць у дзівосным рытме толькі ім зразумелага танца, здаецца, усё навокал замірае ў чаканні нейкага цуду. Лёгкі марозік казыча нашы прадчуванні: вось-вось адкрыецца штосьці таемнае, нязведанае. І мы дружна паддаёмся гэтаму настрою, што стварае для нас прырода і ўласнае ўяўленне, натхняемся і верым, што дзівосы магчымыя. Адкуль усё гэта ў нашым занадта прагматычным жыцці? Мне здаецца, з дзяцінства, калі захапляліся вобразамі казачных герояў, якія вучылі нас дабрыні і прыгажосці, пераконвалі верыць у тое, што дабро заўсёды пераможа зло, а цуд абавязкова здарыцца для добрых людзей.**



**Сцэна са спектакля «Ох і залатая табакерка» віцебскага тэатра «Лялька»**

### Справа дарослых?

Здаўна менавіта доўгімі зімовымі вечарамі людзі любілі расказваць розныя дзівосныя гісторыі. У гэтых няхітрых, шчырых аповедах ажывалі чарадзейныя волаты незвычайнай сілы і здольнасцей, неверагодныя жывёлы, якія ўмелі размаўляць па-чалавечы і нават нешта раілі, розныя міфічныя істоты і жудасныя пачвары. З заміраннем сэрца слухачы сачылі за барацьбой дабра і зла, захапляліся сілай і розумам казачных герояў.

Думаю, для большасці нашых чытачоў захапляльны свет беларускай казкі асацыіруецца з… бабуляй, якая чытала яе не па кніжцы, а расказвала так, нібыта згадвала па памяці прыгоды казачных герояў. Іх, магчыма, яна чула некалі ад сваіх бацькоў. Нетаропкі, прыцішаны і загадкавы аповед закалыхваў, зацягваючы ў салодкі сон… Потым і самі прымяраем на сябе ролю казачніка, перадаючы таямнічасць і харацтво дзецям і ўнукам.

***«Памятаю, пыталася ў мяне: „Вам гэтую казку пра ягадкі як казаць? Як мне мама расказвала альбо з песняй?“».***

– Усё так, – пагаджаецца загадчык сектара этналінгвістыкі і фальклору Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Алена Боганева. – Казка – перш-наперш гэта ўстаноўка на выдумку. Але трэба адзначыць, што раней яна была справай дарослых.

У XIX стагоддзі, паводле слоў фальклярыста Кірыла Чыстова, была і такая практыка: майстра-

казачніка запрашалі ў арцель лесарубаў, што шчыравала на зімовай дзялянцы. Яму нядрэнна плацілі, за гэта казачнік мусіў у леснічоўцы з вечара і, як кажуць, да апошняга слухача баяць чароўныя гісторыі. Вядомая даследчыца Таццяна Берншам згадвала такі факт: казкі ў вёсках расказвалі падчас прастольных свят. І ставіліся да гэтага надзвычай сур'ёзна.

Беларускія навукоўцы Канстанцін Кабашнікаў і Галіна Барташэвіч у 1970-х, а пазней, пачынаючы з 2006 года, і іншыя фалькларысты прыязджалі ў вёску Магільнае Уздзенскага раёна да цудоўнай казачніцы Лідзіі Цыбульскай. У сям'і было пяцёра дзяцей, але толькі яна падхапіла казачную эстафету маці, як і тая ў свой час ад дзядулі. Лідзія Міхайлаўна, калі расказвала казкі, адчувала сябе так упэўнена і вольна, што не цуралася імправізацый у межах сюжэта і атрымлівала ад гэтага сапраўдную асалоду.



Алена Боганева

– Памятаю, пыталася ў мяне: «Вам гэтую казку пра ягадкі як казаць? Як мне мама расказвала альбо з песняй?» – гаворыць Алена Боганева. – Зразумела, мы пагадзіліся на другі варыянт. І калі паводле сюжэта дзяўчаты пайшлі ў лес па ягады, яна заспявала летнюю пятроўскую песню.

Адметна, што казачнай спадчыне Лідзіі Цыбульскай у 2013 годзе нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

У вёсцы Рог Салігорскага раёна даследчыкі пазнаёміліся з таленавітай казачніцай Паўлінай Навумаўнай Ілюшчыц 1925 года нараджэння. Алена Боганева згадвае, як у 2007-м жанчыну запрасілі на этнаграфічны канцэрт «Фальклор беларускай глыбінкі» ў Беларускі ўніверсітэт культуры – «казкамі разбавіць танцавальна-песенныя музычныя нумары». На такіх мерапрыемствах з гасцямі здалёку быў заўсёдны аншлаг. І на гэты раз студэнты абляпілі нават прыступкі лесвіц, стаялі ў праходах. Арганізатары перажывалі, што вясковая казачніца будзе хваляваецца перад такой аўдыторыяй. Ажно не, Паўліна Навумаўна адчувала сябе тут як дома. І прымалі яе надзвычай хораша і цёпла, нават на біс выклікалі.

З таго пакалення казачнікаў няма ўжо нікога. На авансцэну выйшлі маладзейшыя. Адзін з іх Аляксандр Галкоўскі 1959 года нараджэння. Сёння ў вёсцы Судзілы Клімавіцкага раёна ён зорка. У 2016 годзе яго і Алену Боганеву запрасілі ўзяць удзел у III Міжнародным сімпозіуме «Музычная карта свету» ў Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П. Чайкоўскага, на які прыехалі выканаўцы этнічных казачных эпасаў ці не з усяго свету. Па дарозе ў цягніку Галкоўскі скрушна жаліўся сваёй спадарожніцы: «І на што я пагадзіўся? У мяне гаспадарка – чатыры каровы, авечкі, коні, а што я ў Маскве не бачыў?!».

На гэтым мерапрыемстве прадстаўляўся традыцыйны спеўны эпас. Але як быць з казкай

### ЗГАДКА ПРА КАЗКУ

**Аляксандр КАВАЛЕНЯ, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, акадэмік:**

– У час майго вясковага дзяцінства казка была важным сродкам пазнання і фарміравання чалавечых якасцей. Ніхто не казаў пра яе павучальнасць, не разбіралі сюжэтаў, аднак мы заўсёды чакалі добрага канца, пасміхаліся з няўмекаў, радаваліся перамозе дабра над злом.

У нашай дружнай сям'і было шасцёра дзяцей. Бацькі Аляксандр Емяльянавіч і Ганна Аляксандраўна заахвочвалі нашы забавы. Мама звычайна прала ці вязала і расказвала казкі на сямейную тэматыку. Мы ж прыдумвалі бясконцую колькасць сюжэтаў, напрыклад, «Курачкі Рабы»: як карміць і даглядаць, каб яна вырасла незвычайна вялікай і несла шмат яек. Бацька, дырэктар школы, любіў казкі пра шчырых, працавітых, справядлівых людзей. Дагэтуль памятаю казку пра лёгкі хлеб, у якой раскрыта сутнасць стваральнай працы чалавека.

Казка – цэлы сусвет народнай мудрасці, ва ўсёй прыгажосці і хараstве ў ёй адлюстравана духоўная сутнасць народа, яго шчырасць, дабрыня, адкрытасць, спагадлівасць, сумленне, востры гумар і светлая вера ў дабро.



Лідзія Цыбульская навучылася баяць казкі ад маці. Фота 2006 года



Адзін з самых вядомых нашых казачнікаў Аляксандр Галкоўскі ўдзельнічаў на форуме казкі ў Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры. 2018 год

пра змея Нупрэя, якую ён збіраўся расказваць удзельнікам сімпозіума? І ўсё ж вырашыў паспрабаваць спецыяльна – так, як некалі ў іхняй вёсцы спявала гэту казку сляпая лірніца. Выступленне Аляксандра Галкоўскага ў кансерваторыі стала сенсацыяй сярод фалькларыстаў. Праз дзень арганізатары ладзілі адмысловы вечар, прысвечаны фальклорнай спадчыне беларуска-рускага памежжа, на якім наш казачнік расказваў казкі і легенды розных жанраў, спяваў песні.

Цяпер казкі вельмі рэдка расказваюць – іх чытаюць. Кніжак хапае на любы густ і кашалёк, таму для сучасных маці і бабуль не праблема знайсці штосьці для любімага дзіцяці. І можна сцвярджаць, што з дарослага жыцця казкі ўпэўнена пакрочылі ў дзяцінства, у дзіцячы пакой. Слухаюць іх цяпер дзеці, як сцвярджаюць даследчыкі, у асноўным ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў. Але радуе, што па-ранейшаму казкі зачароўваюць, вабяць жанравай разнастайнасцю. А якія яркія і змястоўныя казачныя вобразы! Даследчыкі, што пабывалі ў многіх фальклорных экспедыцыях па Беларусі, і тыя дзівяцца часам з багатай вобразнасці, якой вылучаюцца гэтыя шэдэўры вуснай народнай творчасці.

Алена Боганева расказвала мне сваю любімую казку пра разбойніка Мадэя. Яе яна ўпершыню пачула на Гродзеншчыне ў вёсцы Маркуны Астравецкага раёна гадоў дваццаць таму ад казачніка Станіслава Пазлевіча. Які пакручасты сюжэт: на кож-

### ЗГАДКА ПРА КАЗКУ

**Аляксандр ЛАКОТКА, дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, доктар архітэктуры, доктар мастацтвазнаўства, акадэмік:**

– Некалі з цікавасцю слухаў казкі бабулі і мамы пра жывёл і чарадзейства. Ужо тады адчуваў іх вобразнасць і паэтыку. Героі казак добра вядомыя ўсім і цікавыя тымі ўчынкамі, якімі іх надзяляюць казачнікі розных пакаленняў. Для аповеду дзецям я абраў бы якую-небудзь казку з чарадзейных. Дзяцінства – гэта запатрабаванне цудаў, вера ў іх, крыніца развіцця фантазіі і творчага ўяўлення.

Актуальнасць казкі – у традыцыйнай папулярызацыі маральных каштоўнасцей, у вечнай перамозе дабра над злом. У гэтым і заключаецца яе гуманістычны пафас і гістарычнае значэнне.

ным кроку інтрыга, новыя нечаканасці і чароўныя пераўтварэнні! І ўсё роўна ён вядзе нас да перамогі дабра і міласэрнасці над злом, якое ў казцы першапачаткова ўвасабляе разбойнік Мадэй, а напрыканцы робіцца святым.

Гэта казка адносіцца да легендарных. Таксама ў беларускім казачным эпасе маецца багата чарадзейных казак, якія прасякнуты высокімі ідэаламі, імкненнем да ўзвышанага. Тут абавязкова прысутнічае чарадзейства, незвычайныя героі і іх памочнікі. Словам, свой непаўторны свет, у якім змагаюцца сілы дабра і зла і дзе заўсёды перамагае справядлівасць.

Папулярныя ў нас і казкі пра жывёл. Яны самыя старажытныя. Як кажуць навукоўцы, складаліся яшчэ ў перыяд дакласавай ступені развіцця грамадства. Адметна, што асноўны кампазіцыйны стрыжань такіх казак – падман у самых розных відах і формах. Сучасная мараль яго асуджае, а казкі ўхваляюць як форму выражэння перавагі слабага над дужым. Першая па папулярнасці – ліса, якая вызначаецца хітрасцю. Але з ёй паспяхова змагаюцца і абводзяць вакол носа мудры кот і нават «дурная» варона. На другім месцы ў казачным жывёльным рэйтынгу – воўк са сваёй ненажэрнасцю, прагнасцю і дурасцю. Безумоўна, варта згадаць яшчэ мядзведзя як самага дужага, але не самага разумнага прадстаўніка жывёльнага свету.

***«У казках існуе адзіная канцэпцыя, якую, паводле вызначэння Кірыла Чыстова, можна ўмоўна назваць канцэпцыяй «актыўнага дабра» – дапамогі слабаму, узаемадапамогі, спачування».***

Алена Боганева кажа, што гэтыя казкі ўвогуле нельга ўспрымаць як апавяданні пра жыццё жывёл. Гэта ўмоўнасць, бо ў творах насамрэч адлюстраваны шырокі спектр чалавечых адносін і характараў, малюнкі быту.

Існуюць яшчэ кумулятыўныя (казкі-ланцужок), сацыяльна-бытавыя або навелістычныя, гумарыстычныя або жартоўныя, небыліцы і дакучныя казкі. І для кожнага віду – непаўторная і запамінальная манера аповеду. Тая ж дакучная казка як жартоўная пародыя можа быць вельмі лаканічнай і бясконцай адначасова. «Ішоў бай па сцяне ў чырвоным жупане. Баяць далей, ці не? – Баяць! – Ішоў бай па сцяне ў чырвоным жупане…» І так пакуль не надакучыць.

**ЗГАДКА ПРА КАЗКУ**

**Іван САВЕРЧАНКА, дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы, доктар філалагічных навук, прафесар:**

– У дзяцінстве чуў мноства казак ад дзядулі. Паслухаць яго было найвышэйшай асалодай і найлепшым заняткам.

Беларускія казкі маюць трывалую міфалагічную аснову, з'яўляюцца сведчаннем архаічных уяўленняў нашых далёкіх продкаў аб навакольным свеце – прыродзе і космасе. Гэта адметная прыкмета нашай унікальнасці сярод культур і народаў свету, найважнейшы элемент нацыянальнай самабытнасці беларусаў. Яны з'яўляюцца невычэрпнай крыніцай вывучэння духоўнай гісторыі народа, а таксама кагнітыўнай структуры беларускай мовы.

## З нацыянальнай адметнасцю

Вядомы фалькларыст і літаратуразнаўца Леў Бараг сцвярджаў, што, напрыклад, гераічныя сюжэты і вобразы ў рускім фальклоры сканцэнтраваны ў быліне, ва ўкраінскім – у песнях і думах, а ў беларускім знаходзяць адлюстраванне пераважна ў казках. Але, уласна, якіх казачных герояў мы можам лічыць беларускімі? Напрыклад, тая ж Баба-Яга Касцяная Нага, якая «на ступе ездзіць, таўкачом паганяіць, пумялом след замятаіць». Яе вобраз у нашых казках не надта распаўсюджаны, найчасцей дзейнічае вядзьмарка.

Кашчэй Бессмяротны таксама рэдкі госць у беларускім казачным эпасе. Сярод злых звышнатуральных істот у нашых казках шматгаловы змей, часам цмок. Увогуле, матыў барацьбы з міфічным змеем – адзін з самых распаўсюджаных у міфалогіі і казках народаў свету. У беларускіх казках пачвар адольваюць Кацігарошак, Іван-Дараган, Іван Мядзведжае вушка, моц і зухаватасць дэманструюць



Цмок Паазер’я

Дубінін-асілак, Вернідуб, Гарын-багатыр, Усыня, Ламікамень.

Праўда, з нашым Цмокам справа неадназначная. Паводле міфалагічных паданняў, ён можа быць аднагаловым ці мець ажно да дванаццаці галоў. Велізарны нячысцік з кіпцюрамі, як сярпы. Жыве ў балоце, а найчасцей у возеры. Адным словам – пачвара, злая істота.

Але нашы аматары кінуліся шукаць «сапраўднага» цмока і… знайшлі такіх на Лепельшчыне і Палессі. І нават запэўніваюць, што адзін з іх цяпер жыве ў Лепельскім возеры – не такі страшны і злы, як яго малююць. Атрымаўся «перакрут», сцвярджае айчынная даследчыца Таццяна Валодзіна: у некаторых мясцінах гэтай міфалагічнай істоце імкнуцца надаць не ўласцівую ёй прывабнасць. Відаць, з прагматычных мэт, бо пры добрай раскрутцы цмок можа стаць выдатнай турыстычнай «заманухай», як лахнеская пачвара, не горш.

Паводле слоў Кірыла Чыстова, казкі – жанр, уласцівы ўсім народам. У кожнага з іх свае традыцыі і лёс, але, перакрываючы нацыянальныя і этнічныя асаблівасці і адрозненні, на розных прасторах свету існуе адзіная канцэпцыя, якую можна ўмоўна назваць канцэпцыяй «актыўнага дабра» – дапамогі слабаму, узаемадапамогі, спачування. З іншага боку, казка вобразна і перакана ўча дэманструе адмоўныя якасці адпаведных персанажаў, і зноў жа ў розных народаў яны інтэрнацыянальныя – карыслівасць, чэрствасць, абыякавасць, зайздрасць і г. д. А ў фінале звычайна дабро ўзнагароджваецца, а зло караецца. Гэта асноўная спружына апавядання, закон пабудовы казачнага сюжэта і сэнс самога яго існавання.

Не дзіва, што казачныя героі жывуць на тэатральнай сцэне, у мульфільмах, рэкламе, камп’ютарных гульнях. І нават на манетах. Нацыянальны банк Беларусі выпускаў серыі «Беларускія народныя легенды» і «Казкі народаў свету». Летась супрацоўнікі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору падрыхтавалі абгрунтаванне на выпуск дзвюх новых манетных серый – «Беларускі дзіцячы фальклор» і «Беларускія народныя казкі».

– Пачынаючы з 2023 года, паступова выпусцяць сем манет, кожная з якіх увасобіць пэўную разнавіднасць казачнага жанру. Пра жывёл – казка «Лёгкі хлеб», кумулятыўная – «Верабейчык і былінка», а таксама манеты, прысвечаныя чарадзейным і легендарным казкам, – дэталізуе мая суразмоўца Алена Боганева.

### ЗГАДКА ПРА КАЗКУ

**Уладзімір БАЖАНАЎ, прафесар кафедры паліталогіі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар:**

– У дзяцінстве шмат казак прачытаў. Асабліва памятаю павучальныя – «Пакацігарошак», «Бацькаў дар», «3 рога ўсяго многа». Мяне прыцягвалі магутныя асілкі і разумныя хлопцы, якія каралі прагных багацеяў, выстаўлялі на смех людзям іх заганы і недалёкі розум.

Казка кожнаму адчыняе свой свет дабрыні і справядлівасці, у якім заўжды праўда перамагае зло, дзе каханне і вернасць мацнейшыя за ўсе нягоды і перашкоды. Яна натхняе нас верыць у цуд. У сучасны век электронікі, лічбавых тэхналогій казкі вучаць бачыць людзей, сярод якіх можна знайсці верных сяброў і аднадумцаў.





**Сцэны са спектакля «Дзед і Жораў» паводле п'есы Віталя Вольскага «Чароўныя падарункі», народных казак «З рога ўсяго многа», «Жорава кайстэрка» і «Жораваў кашалёк». Баба – Надзея Чэча, дзед – Валерый Зяленскі. 2022 год**

У кожнага свая гісторыя з казкай. Актрыса Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Надзея Чэча больш як дзясятак гадоў «гуляе ў лялькі» – пераносіць маленькіх гледачоў у загадкавую казачную прастору. Яе знаёмства з чароўным светам пачалося з чытання танюсенькіх каляровых кніжак з казкамі, у савецкі час іх было шмат. Ці думала, што і сама некалі далучыцца да ўвасаблення казачных герояў на сцэне?! Добра памятае першую ролю прынцэсы Будур у спектаклі «Чароўная лямпа Аладзіна». Іграла вяхотку Майдадыра, Чырвоную Шапачку, ліску. Але з усіх яе казачных персанажаў актрысе найбліжэй баба са спектакля-казкі «Дед і жораў» паводле беларускага фальклору.

***«Казка вучыць прыкмячаць асаблівыя рысы характару і наогул стаўленне беларусаў да жыцця».***

– Для мяне гэта зборная выява маіх бабуль, нашай вёскі, такія блізкія і родныя нацыянальныя рысы, – разважае Надзея Чэча. – Гэта персанаж сапраўднай народнай казкі, дзе спалучаюцца іскрынкі гумару і лёгкі сум, павучальныя матывы і дабрыня, якая ідзе ад самага сэрца.

«Ажывіць» любую ляльку няпроста. А калі гэта суцэльныя гліняныя фігуры? Менавіта так выглядаюць галоўныя дзейныя асобы спектакля – дзед і баба.

## ЗГАДКА ПРА КАЗКУ

**Анатоль ЛАЗАРЭВІЧ, дырэктар Інстытута філасофіі, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт:**

– Згадваюцца «Заяц і вожык», «Сабака і воўк», «Лісіца і журавель», «Лёгкі хлеб», «Не сілай, а розумам». Звычайна казкі чытала мама. Бацька любіў сам нешта расказваць, выкарыстоўваючы розныя прыказкі і прымаўкі. Хто дзятла ведаў бы, калі б не яго доўгі нос – вакол гэтага мог пабудаваць павучальную гісторыю.

Казачныя персанажы цікавыя сваімі паводзінамі, дасціпнымі выказваннямі. Яны ўвасабляюць пэўную выяву і рысы: ліса – хітрасць, мядзведзь – сілу, нязграбнасць, сабака – вернасць, воўк – небяспеку. Заўсёды чаканай была перамога дабра над злом. Народная казка – гэта свет вачыма народа, абыгрыванне людзьмі з пазіцый іх жыццёвай мудрасці тых ці іншых сітуацый. Традыцыя захоўваецца і сёння, але сама народнасць становіцца іншай, падмяняецца штучнымі эфектамі. Можа таму сучасных дзяцей прываблівають мемы з японскіх анімэ, Хагі Вагі, Кісі Місі і іншыя.

– Трэба ўмець адчуваць, што ў твайго героя таксама ёсць душа, характар, нейкія асаблівыя рысы. Мая баба, напрыклад, нават размаўляць можа з дыялектам, уласцівым нейкай канкрэтнай мясцовасці, – усміхаецца актрыса.

Толькі калі вельмі глыбока пераўвасобіцца ў казачны персанаж, глядач паверыць… у казку, лічыць Надзея Чэча.

– Казка заўжды са мной, – працягвае мая суразмоўца. – І менавіта лялька дае мне адчуванне незвычайнага яе хараства, багацця народнага гумару. Казка вучыць прыкмячаць асаблівыя рысы характару і наогул стаўленне беларусаў да жыцця. І вельмі рада, што праз сваіх лялечных герояў магу падзяліцца гэтым скарбам з наведвальнікамі тэатра.

Кажуць, хочаш ведаць, чым і як жыве народ, што ён сабой уяўляе, – паслухай яго песні. Мне ж здаецца, каб зразумець, адкуль у беларусаў такія прывабныя рысы, як надзея, шчырасць, адкрытасць і мудрасць, варта пачытаць нашы казкі. Магчыма, часцінка гэтага «сакрэту» ідзе ад першай бабулінай казкі, якая шчодра пасыпала зярнятамі дабрыні наша жыццё.

***Сняжана МІХАЙЛОЎСКАЯ***

***Фота БЕЛТА, з архіваў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек, з адкрытых крыніц***